***Янская В. В.**, настаўніца пачатковых класаў Сейлавіцкай сярэдняй школы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці*

# Правілы бяспечных паводзін на вадзе

## Асновы бяспекі жыццядзейнасці. II клас

***Мэта:*** фарміраванне ўяўленняў пра неабходнасць прытрымлівацца бяспечных паводзін на вадаёмах, рэках і побач з імі ў розныя поры года.

***Задачы:***

•азнаёміць з правіламі бяспечных паводзін у час знаходжання каля вадаёмаў і рэк летам і зімой;

•замацаваць веды пра змены ў прыродзе, што адбываюцца ў розныя поры года;

•развіваць маўленне, назіральнасць, увагу;

•выхоўваць беражлівыя адносіны да свайго здароўя.

***Абсталяванне:*** вучэбны дапаможнік «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» (Т. Ю. Аброськіна, Л. А. Аднавол, Л. Ф. Кузняцова, 2024); ілюстрацыйны матэрыял; карткі для калектыўнай, індывідуальнай і групавой работы.

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

— Тыя, хто прачнуўся рана, паківайце галавой. Тыя, хто хочуць даведацца нешта новае, папляскайце ў далоні. У каго добры настрой — усміхніцеся адзін аднаму.

— Зробім усё, каб захаваць добры настрой да канца ўрока!

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

Настаўнік прапануе адгадаць загадку:

Яна ў морах і ў акіянах,
У азёрах, лужынах і ў рацэ.

Цячэ ў дамах з нашых кранаў,
Не выжыць без яе табе.
*(Вада.)*

— Чаму без вады нам не выжыць?

— У выглядзе чаго праяўляецца вада ў прыродзе? *(Туман, вясёлка, дождж, снег, град, іней.)* А калі сонечнае святло праходзіць скрозь кроплі дажджу ці туману, то можна пабачыць такую з’яву, як вясёлка!

Настаўнік вывешвае на дошку ілюстрацыі (мал. 1).








***Малюнак 1***

— Дзе ў прыродзе сустракаецца вада? *(Крыніцы, азёры, рэкі, моры, акіяны, вадасховішчы, балоты.)*

Настаўнік вывешвае на дошку ілюстрацыі вадаёмаў (мал. 2).









***Малюнак 2***

— Якое значэнне вада мае для жывой прыроды, у тым ліку і для чалавека? *(Без вады расліны завянуць і загінуць. Жывёлы, людзі таксама без вады хутка загінуць.)*

— Малайцы! Вада — добры сябар і памочнік чалавека. Але бываюць выпадкі, калі яна можа стаць для чалавека ворагам. Адкажыце, калі так адбываецца? *(Паводка, калі залiваюць зверху суседзі, калі мы плаваем і пачынаем тануць…)*

**III. Паведамленне тэмы і мэты ўрока.**

— Перад вамі зашыфраваная тэма ўрока Закрэсліце літары ***ОЮ*** і расшыфруйце словы. *(Небяспека на вадзе.)*

*НЮЕОЮБОЮЯОЮСОЮПОЮЕКОЮАНОЮАВОЮАОЮДОЮЗОЮЕ*

— Як вы думаеце, пра што сёння пойдзе гаворка на нашым ўроку? *(Небяспека на вадзе.)*

— Якую небяспеку можа прынесці вадаём? Як яе пазбегнуць?

— Сёння на ўроку мы пагаворым пра правілы бяспечных паводзін на вадзе. Вы даведаецеся, як трэба паводзіць сябе на вадаёмах у розныя поры года, каб не сапсаваць сабе адпачынак.

**IV. Вывучэнне новай тэмы.**

— Мы часта гаворым слова вадаём. А хто адкажа, што такое вадаём? *(Вадаём — месца назапашвання або захоўвання вады.)*

— Паглядзіце на карту нашай краіны. Чаму нашу краіну называюць сінявокай?

— Правільна. У нашай краіне шмат рэк і азёраў. Таму яе называюць сінявокай. На тэрыторыі Беларусі больш за 20 тысяч рэк, 10 тысяч азёр і 150 вадасховішчаў.

— Якія рэкі і азёры вы ведаеце? (Адказы вучняў.) Ці ёсць у Беларусі мора? *(Няма.)*

— Ці можна сказаць, што вада — жыццёвая неабходнасць, прыгажосць?

— Ці аднолькава вядуць сябе вадаёмы ў розныя поры года? *(Рэкі і азёры вядуць сябе па-рознаму ў розныя поры года.)* Што адбываецца з вадаёмамі ў розныя поры года?

— Летам, у сонечнае надвор’е, вада светлая і спакойная; восенню, у дажджлівае і ветранае надвор’е, — мутная, пагрозлівая; зімою — скаваная лёдам. А вясной адбываецца крыгаход. Калі вы знаходзіцеся каля вадаёма, то павінны ўлічваць яго стан у розныя поры года, у рознае надвор’е і выконваць пэўныя правілы паводзін.

Настаўнік вывешвае на дошку карцінкі вадаёмаў у розныя поры года (мал. 3).










***Малюнак 3***

— Хутка настане лета, і вам захочацца адпачыць на беразе вадаёма. Каб вадаёмы заўсёды прыносілі чалавеку радасць, патрэбна ведаць правілы бяспечных паводзін каля вады, на вадзе і выконваць іх.

**Праца з вучэбным дапаможнікам.**

Вучні чытаюць па адным сказе другога і трэцяга абзацаў на с. 101–102 вучэбнага дапаможніка і называюць асноўныя правілы бяспечных паводзін на вадаёмах. Настаўнік вывешвае правілы на дошку.

— Дзе самае бяспечнае месца для адпачынку ў летні час? Чаму так лічыце?

— Чым абсталяваны пляж?

Разгледзьце малюнкі.

— Хто з дзяцей няправільна сябе паводзіць? Якія парады вы можаце ім даць?

***Фізкультхвілінка.***

Вучні выконваюць рухі па тэксце:

Да рэчкі хутка мы спусціліся,
Нахіліліся і памыліся.
Раз, два, тры, чатыры,
Вось як добра асвяжыліся.
А зараз паплылі мы дружна.
Рабіць рукамі трэба так:
Разам — раз, гэта — брас.
Адной, другой — гэта кроль.
Усе, як адзін, плывём, як дэльфін.
Выйшлі на бераг круты
І адправіліся дадому мы.

— Дзеці, скажыце, ці толькі летам мы ходзім на вадаём?

— Мы многа гаварылі з вамі пра правілы паводзін на вадаёме зімой. Давайце паспрабуем успомніць, што мы ўжо ведаем? (Адказы дзяцей.)

**Праца з вучэбным дапаможнікам.**

Чытанне часткі тэксту на с. 103 вучэбнага дапаможніка пра небяспеку на вадаёмах, рэках зімою і вясною.

Настаўнік вывешвае правілы на дошку.

— Ці небяспечныя вадаёмы зімою, калі вада скаваная лёдам? А вясною, калі лёд растае?

— Чаму нельга выкарыстоўваць лёд на вадаёмах для катання на каньках і пераправы на другі бераг?

— У чым небяспека самастойнага (без дарослых) наведвання вадаёмаў летам і зімой?

**V. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**Работа ў парах.**

***Гульня «Крыжыкі-нулікі».***

Вучні у табліцы ставяць ×, калі сцверджанне правільнае, і 0 — калі няправільнае. Пасля выканання задання калектыўна праводзіцца праверка, адказы каменціруюцца.

| | | |
|---|---|---|
| Можна плаваць на камерах і іншых самаробных плавальных сродках | Можна выходзіць на лёд вадаёма | Можна купацца ў спецыяльна абсталяваных месцах |
| Трэба на сонцы апранаць галаўны ўбор | Можна купацца ў вадаёмах толькі ў цёплы час і ў цёплай вадзе | Трэба абавязкова вучыцца плаваць |
| Трэба купацца ў вадаёмах пад наглядам дарослых | Трэба заплываць за ўсталяваныя на пляжы буйкі | Можна ныраць у незнаёмых месцах |

*Адказ.*

| | | |
|---|---|---|
| 0 | 0 | × |
| × | × | × |
| × | 0 | 0 |

**Франтальная работа.**

— Як называюць чалавека, якія назірае за паводзінамі людзей і аказвае дапамогу, калі каму-небудзь стала дрэнна ці калі чалавек пачаў тануць? *(Ратаўнік.)*

Настаўнік вывешвае на дошку ілюстрацыю ратавальніка і прадметаў (мал. 4).

— У кожнага ратаўніка ёсць прадметы, якімі ён карыстацца. Давайце выберам тыя, што патрэбныя ратаўніку.

| | | |
|---|---|---|
|  |  |  |
|  |  |  |
|  |  |  |
|  |  |  |

***Малюнак 4***

**Праца ў групах.**

Вучні разглядаюць малюнкі (мал. 5).

— Хто з дзяцей няправільна паводзіць сябе? Якія парады вы можаце даць дзецям?

| | | |
|---|---|---|
|  |  |  |
|  |  |   |

***Малюнак 5***

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

***Гульня «Так ці не».***

— Купацца можна толькі ў спецыяльна адведзеным месцы. *(Так.)*

— Улетку дзецям можна купацца без дарослых. *(Не.)*

— Правілы паводзін на вадзе трэба выконваць усім, нават тым, хто добра плавае. *(Так.)*

— Дзецям можна выходзіць на лёд вадаёма. *(Не.)*

— Нельга заплываць за буйкі. *(Так.)*

— Нельга заплываць далёка на надзіманым матрацы. *(Так.)*

**VII. Рэфлексія.**

На дошцы запісаныя выразы:

*Сёння я даведаўся…*

*Мне было цікава…*

*Мне было цяжка…*

*Я зразумеў, што…*

*Я навучыўся…*

*Мяне здзівіла…*